# Арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху на Віцебшчыне ў 1924–1926 гадах (па матэрыялах Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі)

УДК 908:94(476.5)



**Аляксандр БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук**

Аляксандр БАРАНОЎСКІ. Арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху на Віцебшчыне ў 1924–1926 гадах (па матэрыялах Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі). Сто гадоў таму пры Інстытуце беларускай культуры было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства – агульнарэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр краязнаўчай работы. Час дзейнасці ЦБК прыйшоўся на 1920-я гады, якія ў гістарыяграфіі атрымалі назву «залатога дзесяцігоддзя краязнаўства». У артыкуле на падставе матэрыялаў з фондаў ЦНБ НАН Беларусі адлюстравана арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху Савецкай Беларусі ў лакальным вымярэнні на прыкладзе Віцебшчыны.

Ключавыя словы: краязнаўства, краязнаўчы рух, Віцебшчына, Цэнтральнае бюро краязнаўства, краязнаўчыя таварыствы, краязнаўчыя гурткі, Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі.

Aleksandr BARANOVSKY. Institutionalization of the local history movement in Vitebsk Region in 1924–1926 (based on the documents from the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus). 100 years ago the Institute of Belarusian Culture set up the Central Bureau of Local History, a national scientific and methodological center of local history work. The Central Bureau of Local History was active in the 1920s, the period dubbed in historiography as "the golden decade of local history". The article, drawing on the documents from the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus, looks into the institutionalization of the local history movement of Soviet Belarus in terms of local dimension on the example of Vitebsk Region.

Keywords: local history, local history movement, Vitebsk Region, Central Bureau of Local History, local history organizations, local history clubs, Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.

Сто гадоў таму, у студзені 1924 года, пры Інстытуце беларускай культуры было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). Час дзейнасці ЦБК атрымаў у гістарыяграфіі назву «залатога дзесяцігоддзя краязнаўства». У Цэнтральным навуковым архіве Нацыяльнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі), які знаходзіцца ў структуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі, захоўваецца значны комплекс дакументаў па гісторыі краязнаўчага руху Савецкай Беларусі 1920–30-х гадоў. Гістарычны досвед арганізацыйнага афармлення краязнаўчага руху 1920-х гадоў запатрабаваны і сёння. У нашай краіне краязнаўчы рух не мае цэнтралізаванай структуры, ініцыятывы, і гурткі дзейнічаюць самі па сабе. У сувязі з гэтым на падставе аналізу дакументаў і матэрыялаў з фондаў ЦНА НАН Беларусі было вырашана падрыхтаваць гэты артыкул, у якім адлюстроўваецца арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху Савецкай Беларусі ў лакальным вымярэнні на прыкладзе Віцебшчыны. Пад Віцебшчынай у даследаванні трэба разумець тэрыторыю Аршанскай, Барысаўскай, Віцебскай і Полацкай акруг, якія цяпер знаходзяцца ў складзе Віцебскай вобласці.

Інстытуалізацыя краязнаўчага руху на Віцебшчыне пачалася яшчэ тады, калі Віцебская губерня знаходзілася ў складзе РСФСР. У Савецкай Расіі ЦБК было створана ў 1922 годзе, што, безумоўна, спрыяла арганізацы



**Першае праўленне Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства. 1925 год**
Крыніца: зборнік «Віцебшчына». Ч. 1, 1925 год.

мясцовых краязнаўчых гурткоў і таварыстваў. Стварэнне губернскай краязнаўчай арганізацыі пачалося ў лютым 1924 года – напярэдадні ўз'яднання Віцебшчыны з Беларуссю і раянавання БССР. Нарада па пытаннях арганізацыі ў Віцебску краязнаўчага таварыства адбылася 1 лютага 1924 года. На ёй старшынстваваў сакратар Віцебскага губернскага метадычнага бюро Васіль Дракін. У сваім выступе ён адзначыў, што неабходнасць арганізацыі губернскага краязнаўчага таварыства выклікана выкананнем адукацыйных праграм Дзяржаўнага вучонага савета Народнага камісарыята асветы РСФСР. «Школьным работникам неизбежно необходимо знание краеведческого материала. На нем должен быть построен весь план школьной работы, поскольку материал этот не собирался, не изучался, не разрабатывался» *[1, арк. 3]*. Ідэя арганізацыі краязнаўчага таварыства была падтрымана прысутнымі. Галоўным вынікам нарады стала ўтварэнне пяці секцый: педагагічнай (адказны – В.М. Дракін), натуральна-геаграфічнай (У.З. Венцкевіч), эканамічнай (Я.А. Елянеўскі), культурна-гістарычнай (М.М. Багародскі), этнаграфічнай (Д.М. Васілеўскі) *[1, арк. 3–3 адв.]*.

Планаванне работы секцый абмяркоўвалася 2 сакавіка 1924 года на сходзе па арганізацыі краязнаўчага таварыства пры Віцебскім губернскім аддзеле народнай адукацыі. Сход зацвердзіў план работы культурна-гістарычнай секцыі і выказаўся за паскарэнне складання плана работы таварыства ў цэлым. Асноўная ўвага прысутных была сканцэнтравана на двух пытаннях: выбары праўлення і прыняцце статута краязнаўчага таварыства. У выніку сход устрымаўся ад абрання праўлення да афіцыйнай рэгістрацыі таварыства, пакінуўшы ў якасці

## ПРА АЎТАРА

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Віктаравіч.

Нарадзіўся ў 1992 годзе ў г. Сянно Віцебскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (2016), магістратуру пры ім (2017), аспірантуру пры Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2020).

У 2020–2023 гадах працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Са снежня 2023 года – у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: намеснік, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце.

Кандыдат гістарычных навук (2021).

Аўтар больш як 90 навуковых публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі Беларусі, краязнаўства Сенненшчыны.

кіруючага органа часовае бюро, абранае на папярэдняй нарадзе, у складзе Данілы Васілеўскага (старшыня), Мікалая Багародскага (сакратар), Васіля Дракіна, Уладзіміра Венцкевіча і Яцака Елянеўскага. У абмеркаванні праекта статута прынялі актыўны ўдзел Д.М. Васілеўскі, А.П. Сапуноў, У.П. Сянькоўскі, К.І. Ціхаміраў і М.С. Сухарукаў. Усе выказаныя заўвагі былі ўлічаны, пасля чаго статут прынялі і перадалі на зацвярджэнне прэзідыуму Віцебскага губвыканкама *[1, арк. 4–4 адв.]*.

Паводле статута, Віцебскае таварыства краязнаўства пры губернскім аддзеле народнай адукацыі распаўсюджвала сваю дзейнасць на ўсю тэрыторыю Віцебскай губерні, пры гэтым было зроблена ўдакладненне, што ў выніку магчымай ліквідацыі губерні (мелася на ўвазе ў выпадку вяртання яе тэрыторыі ў склад Беларускай рэспублікі і раянавання ўз'яднанай БССР) таварыства будзе даследаваць галоўным чынам Віцебскую акругу ці раён. Краязнаўчае таварыства з'яўлялася юрыдычнай асобай. Члены таварыства падзяляліся на тры групы: правадзейныя члены (заснавальнікі таварыства, актыўныя ўдзельнікі краязнаўчага руху), ганаровыя члены (даследчыкі, якія зрабілі значны ўнёсак у гістарыяграфію і мелі асаблівыя заслугі перад краем), члены-супрацоўнікі (асобы, якія дапамагалі таварыству ў яго працы). Правадзейныя і ганаровыя члены абіраліся на агульным сходзе таварыства, члены-супрацоўнікі залічваліся праўленнем таварыства. Крыніцай фінансавання Віцебскага таварыства краязнаўства з'яўляліся дзяржаўныя субсідыі, дабравольныя ахвяраванні, даходы ад продажу выданняў, лекцый, выстаў і інш. Выканаўчым органам таварыства згодна са статутам з'яўлялася праўленне. Яно складалася са старшыні, намеснікаў старшыні, скарбніка, членаў праўлення і абіралася агульным сходам тэрмінам на адзін год. Галоўнай мэтай краязнаўчага таварыства паводле статута з'яўлялася ўсебаковае вывучэнне прасторы Віцебшчыны ў натуральна-гістарычных, этнографа-лінгвістычных і географа-эканамічных адносінах *[1, арк. 2–2 адв.]*.

**Удзельнікі Віцебскай акруговай краязнаўчай канферэнцыі. 26–27 красавіка 1925 года**
Крыніца: зборнік «Віцебшчына». Ч. 1, 1925 год.



Праз два дні пасля прыняцця статута таварыства – 4 сакавіка 1924 года – старшыня Віцебскага губвыканкама Д.Ф. Прышчэпаў разам са старшынёй Паўнамоцнай камісіі СНК БССР па прыёмцы тэрыторыі Віцебскай губерні І.А. Адамовічам падпісалі акт аб далучэнні часткі тэрыторыі Віцебскай губерні да БССР. Дзяленне на воласці і паветы на тэрыторыі былой Віцебскай губерні захоўвалася да 17 ліпеня 1924 года, калі на ІІ сесіі ЦВК БССР VI склікання было прынята новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне БССР на акругі – раёны – сельсаветы. На тэрыторыі былой Віцебскай губерні, што вярнулася ў склад БССР, былі ўтвораны Аршанская, Віцебская і Полацкая акругі. Пэўная частка тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці ўваходзіла ў склад Барысаўскай акругі. Уз'яднанне Віцебшчыны з Беларуссю прывяло да аб'яднання краязнаўчага руху Віцебшчыны з агульнабеларускім краязнаўчым рухам. Сетка краязнаўчых таварыстваў паўтарала адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР за выключэннем сельсаветаўскага ўзроўню. На першасным узроўні краязнаўчыя арганізацыі былі прадстаўлены гурткамі.



М.М. Багародскі

Паводле архіўных звестак, першым акруговым таварыствам, арганізаваным на тэрыторыі былой Віцебскай губерні, стала Аршанскае. Яно ўзнікла напрыканцы чэрвеня 1924 года *[2, арк. 191]*. Старшынёй арганізацыі быў абраны Васіль Савуліч, намеснікам – Вінаградаў, сакратаром – Аляксандр Акулік. У склад праўлення таварыства ўвайшлі Апановіч, Кіпрыянец, Котаў, Хаіт, Храпкоўскі, Шулькоўскі. Статут Аршанскага акруговага таварыства краязнаўства быў зарэгістраваны 16 студзеня 1925 года. За год працы таварыства адбылося 14 пасяджэнняў праўлення, два агульныя сходы, акруговая краязнаўчая канферэнцыя. Усяго было разгледжана 85 пытанняў, заслухана пяць навуковых дакладаў *[3, с. 16–23]*.



А.П. Сапуноў

Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства было арганізавана напрыканцы жніўня 1924 года. Праўленне таварыства ўзначаліў Мікалай Каспяровіч. Яго намеснікам абраны Г. Багдановіч, а сакратаром праўлення – Я. Варпаховіч. У склад праўлення таксама ўвайшлі Я. Алонаў, М. Багародскі, А. Брадоўскі, В. Дракін, В. Сянкевіч і Я. Чарнабродаў *[1, арк. 16]*. Статут Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства зарэгістраваны 22 красавіка 1925 года. На першых чатырох агульных сходах акруговага таварыства заслуханы наступныя даклады: «История города Витебска», «Жизнь и деятельность Сапунова», «Основные моменты белорусского движения», «Памятники витебских ремесленных организаций в старину», «Архивы и архивная работа Витебщины», «Витебская архитектура». Сярод раённых таварыстваў краязнаўства першае ў Віцебскай акрузе было арганізавана ў Лёзне *[1, арк. 10]*. За год плённай працы Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства выпусціла восем выданняў, правяло 46 пасяджэнняў і больш за 35 лекцый *[1, арк. 21]*.

Полацкае акруговае таварыства краязнаўства арганізавана ў пачатку студзеня 1925 года. Праўленне ўзначаліў Аўчыннікаў. Сакратаром абраны Сяргей Мялешка *[2, арк. 199]*.



М.І. Каспяровіч

Услед за стварэннем акруговых таварыстваў пачалася арганізацыя раённых таварыстваў краязнаўства і краязнаўчых гурткоў. На працягу 1924–1926 гадоў адбылася канчатковая інстытуалізацыя (ЦБК – акруговыя таварыствы – раённыя таварыствы – асобныя гурткі) краязнаўчага руху на Віцебшчыне (табл.).

**Спіс краязнаўчых арганізацый Віцебшчыны паводле звестак ЦБК на 13 мая 1926 года**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 191, 193–194 адв.

| Назва арганізацыі | Час утварэння | Колькасць членаў | Склад праўлення | Адрас |
|---|---|---|---|---|
| Аршанскае акруговае таварыства краязнаўства | 23 чэрвеня 1924 г. | 51 | старшыня Саўліч, сакратар Васілеўскі | Орша, Дом працаўнікоў асветы |
| Гурток краязнаўства пры Аршанскім рабфаку | кастрычнік 1924 г. | 72 | кіраўнікі: Цэхановіч і Глінскі | Орша, рабфак |
| Аршанскае раённае таварыства краязнаўства | 30 чэрвеня 1925 г. | 42 | | Саўгас Забалоцце, Веравайшанскі с/с, Аршанская акруга |
| Багушэўскае раённае таварыства краязнаўства | 28 красавіка 1925 г. | 56 | сакратар Мартусэвіч | Станцыя Багушэўская, Аршанская акруга |
| Дубровенскае раённае таварыства краязнаўства | жнівень 1925 г. | 40 | | Дуброўна, Аршанская акруга |
| Ляднянскае раённае таварыства краязнаўства | 22 кастрычніка 1924 г. | 49 | старшыня Калецкі, намеснік Міхайлоўскі, сакратар Кляус | Ляды, Аршанская акруга |
| Талачынскае раённае таварыства краязнаўства | 9 мая 1925 г. | 84 | старшыня Егерман | Талачын, Аршанская акруга |
| Бягомльскае раённае таварыства краязнаўства | верасень 1925 г. | 5 | | Бягомль, Барысаўская акруга |
| Лепельскае раённае таварыства краязнаўства | чэрвень 1925 г. | 94 | | Лепель, Барысаўская акруга |
| Каменскае аддзяленне Лепельскага раённага таварыства | | | | Камень, Лепельскі раён, Барысаўская акруга |
| Рыгоравіцкае аддзяленне Лепельскага раённага таварыства | | | | Рыгоравічы, Лепельскі раён, Барысаўская акруга |
| Чарэйскае раённае таварыства краязнаўства | 10 лістапада 1925 г. | 69 | старшыня Бельскі, намеснік Дагурэвіч, сакратар Лукашэвіч | Чарэя, Барысаўская акруга |
| Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства | 25 жніўня 1924 г. | | старшыня Бутар, намеснікі Крываносаў і Цярэшчанка, сакратары Каспяровіч і Варпаховіч | Віцебск, вуліца Пушкіна, 3. Белпедтэхнікум |
| Гурток беларусазнаўства пры ветэрынарным інстытуце ў Віцебску | І7 сакавіка 1925 г. | 83 | Старшыня Чунурын | Віцебск. Ветэрынарны інстытут |
| Гурток краязнаўства пры Віцебскім кааператыўным тэхнікуме | 10 кастрычніка 1925 г. | 75 | старшыня Мініч, намеснік Крывіцкая, сакратар Барозна | Віцебск. Кааператыўны тэхнікум |
| Паўднёва-Віцебскае раённае таварыства краязнаўства | 21 лістапада 1925 г. | 81 | старшыня Мумскі | Віцебск, Магілёўскі пляц 10. |
| Астровенскі гурток краязнаўства | 2 студзеня 1926 г. | 15 | старшыня Бажэлка | Астроўна, Віцебскі раён, Віцебская акруга |
| Бешанковіцкае раённае таварыства краязнаўства | 22 сакавіка 1925 г. | 60 | старшыня Габруковіч | Бешанковічы, Віцебская акруга |
| Высачанское раённае таварыства краязнаўства | 20 снежня 1924 г. | 27 | старшыня Сумнікаў | Высачаны, Віцебская акруга. Сямігодка |
| Гарадоцкае раённае таварыства краязнаўства | 31 ліпеня 1925 г. | 65 | старшыня Леванёнак, сакратар Пузырэўскі, загадчык музея Палескі. | Гарадок, Віцебская акруга |
| Езярышчанскае раённае таварыства краязнаўства | май 1925 г. | 40 | | Езярышча, Віцебская акруга |

*Заканчэнне.* **Спіс краязнаўчых арганізацый Віцебшчыны паводле звестак ЦБК на 13 мая 1926 года**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 191, 193–194 адв.

| Назва арганізацыі | Час утварэння | Колькасць членаў | Склад праўлення | Адрас |
|---|---|---|---|---|
| Лёзненскае раённае таварыства краязнаўства | 2 лістапада 1924 г. | | | Лёзна, Віцебская акруга. |
| Лаўжанскі гурток краязнаўства | 19 кастрычніка 1925 г. | 69 | старшыня Караткевіч, скарбнік Далгаполаў, сакратар Іванава | Лоўжа, Сіроцінскі раён, Віцебская акруга. Сямігодка |
| Пустынскі гурток краязнаўства | 13 снежня 1925 г. | 12 | старшыня Шашкоўскі, сакратар Астрашановіч | Пустынкі, Сенненскі раён, Віцебская акруга |
| Сенненскае раённае таварыства краязнаўства | 7 красавіка 1925 г. | 47 | старшыня Ягодка | Сянно, Віцебская акруга |
| Чашніцкае раённае таварыства краязнаўства | 5 ліпеня 1925 г. | 44 | | Чашнікі, Віцебская акруга |
| Янавіцкі гурток краязнаўства | 17 студзеня 1926 г. | 16 | | Янавічы, Суражскі раён, Віцебская акруга |
| Межынскае раённае таварыства краязнаўства | 24 красавіка 1925 г. | 524 | старшыня Казакоў, сакратар Трус, члены Палівода, Каралеў, Галацкі, Іваноў | Станцыя Бачыха |
| Гурток краязнаўства пры Віцебскім аб'яднанні асветнікаў Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі | | 40 | Багародскі, Пароменскі, Нікіфароўскі, Мікалаеў | Станцыя Віцебск Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі |
| Полацкае акруговае таварыства краязнаўства | 2 студзеня 1925 г. | 60 | старшыня Аўчыннікаў, сакратар Мялешка | Полацк. Акруговы аддзел народнай асветы |
| Гурток краязнаўства пры Полацкім Белпедтэхнікуме | 5 кастрычніка 1925 г. | 94 | старшыня Мялешка | Полацк. Педтэхнікум |
| Гурток краязнаўства пры Полацкім лясным тэхнікуме | 4 красавіка 1926 г. | 120 | старшыня Сораж, сакратар Кораневіч | Полацк, Лясны тэхнікум |
| Полацкае раённае таварыства краязнаўства | 1 верасня 1925 г. | 35 | арганізатар Шпакоў | Полацк. Райвыканкам |
| Асвейскае раённае таварыства краязнаўства | красавік 1924 г. | 46 | старшыня Квіліс, сакратар Глаценак | Асвея, Полацкая акруга |
| Валынцаўскае раённае таварыства краязнаўства | 3 кастрычніка 1925 г. | 61 | старшыня Пятроў, сакратар Пятрова | Валынцы, Полацкая акруга |
| Ветрынскае раённае таварыства краязнаўства | 2 лістапада 1925 г. | 58 | старшыня Мурашка, члены праўлення Вольскі і Уладзімірскі | Ветрына, Полацкая акруга |
| Ульскае раённае таварыства краязнаўства | 5 жніўня 1925 г. | 29 | старшыня Палашчэнка | Улла, Полацкая акруга |
| Ушацкае раённае таварыства краязнаўства | 27 сакавіка 1925 г. | 49 | члены праўлення Гусарскі, Нічыпараў, Урбан | Ушачы, Полацкая акруга |
| Дрысенскае раённае таварыства краязнаўства | 29 сакавіка 1926 г. | 55 | | Дрыса, Полацкая акруга. Сямігадовая школа |
| Чырванапольскае раённае таварыства краязнаўства | 15 сакавіка 1925 г. | 36 | старшыня Хрылеў, члены праўлення Мятла, Брук | Станцыя Дрэтунь, Полацкая акруга. Чырванапольскі раённы мясцком працаўнікоў асветы |
| Гурток краязнаўства пры Обальскай школе сялянскай моладзі | 10 снежня 1925 г. | 60 | кіраўнікі Пятроў, Прышывалка, Кандыбаў | Обаль, Ульскі раён, Полацкая акруга |

Паводле звестак, прыведзеных у табліцы, на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці ў маі 1926 года дзейнічалі тры акруговыя таварыствы краязнаўства, 25 раённых таварыстваў краязнаўства, 12 краязнаўчых гурткоў. У асноўным усе гэтыя краязнаўчыя арганізацыі ўзніклі на працягу 1925 года.

Паміж Цэнтральным бюро краязнаўства і краязнаўчымі таварыствамі была наладжана добрая сувязь. Праз справаздачныя дакументы акруговых і раённых таварыстваў краязнаўства «Схема справаздачнага дакладу краязнаўчых арганізацый (таварыстваў, гурткоў)» і «Анкета, якую кожная краязнаўчая арганізацыя павінна запоўніць і пераслаць у ЦБК» у цэнтральным краязнаўчым органе краіны добра ведалі пра стан краязнаўчай справы на месцах, а таксама як ЦБК магло дапамагчы таварыствам і гурткам. Для даследчыкаў найбольшую цікавасць уяўляюць наступныя графы гэтых дакументаў: калі ўтварылася таварыства, колькасць членаў, склад праўлення, аддзяленні таварыства, сувязь з савецкімі партыйнымі, прафсаюзнымі і грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі, у чым павінна быць дапамога з боку ЦБК, ці задавальняе арганізацыю часопіс «Наш край» і інш. *[1; 4–5]*.


АНКЕТА,

якую кожная краязнаўчая арганізацыя павінна запоўніць і пераслаць у ЦБК.

1. Назва і адрас таварыства, (альбо гуртка) Сенненскае раённ. т-ва краязнаўства. г. Сянно.
2. Час першага арганізацыйнага сходу 14/X–26 г.
3. Па чыёй ініцыятыве ўтворана
4. Склад праўленьня
5. Лік членаў таварыства
6. Плян і праграма працы (ці ёсьць?) Ёсць
7. Ці пачалася арганізацыя музэю?
8. Лік адбытых агульных сходаў з адзначэньнем ліку прысутных членаў таварыства і староньніх асоб (паасобку)
9. Якія пытаньні разглядаліся?
10. Іншая краязнаўчая праца таварыства
11. Сувязь з мясцовымі музэямі і архівамі
12. Сувязь з партыйнымі, савецкімі, коопэрацыйнымі, навуковымі і вучэбнымі ўстановамі
13. Пералічыць аддзяленьні таварыства; даць іх адрасы і ведамасьці аб іх дзейнасьці
14. Якія перашкоды ў працы мае Вашае таварыства?
15. У чым павінна выявіцца дапамога з боку ЦБК?
16. Іншыя Вашыя думкі на конт краязнаўчае працы ў Вашай мясцовасьці і наагул

15/XI–26 г.

**Анкета Сенненскага раённага таварыства краязнаўства Віцебскай акругі**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі.

У фондах Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі найбольш прадстаўлены справаздачы Віцебскага і Барысаўскага акруговых таварыстваў краязнаўства. З іх можна даведацца, што ў Бешанковічах, Лёзне, Суражы і Чашніках пры сямігодках пачалася арганізацыя музеяў. У Гарадку райвыканкам прадставіў таварыству памяшканне для размяшчэння экспазіцыі. Аб важнасці краязнаўчага руху сведчыць той факт, што сярод членаў і старшынь праўлення таварыстваў трапляліся члены райкамаў КП(б)Б. Краязнаўчыя таварыствы ў цэлым былі задаволены працай часопіса «Наш край», аднак выказвалі прапанову павялічыць колькасць метадычных артыкулаў *[1; 4–5]*.

Гісторыю, як вядома, ствараюць людзі. Даследаванне жыцця і дзейнасці як выбітных краязнаўцаў, так і апантаных даследчыкаў роднага краю з'яўляецца як ніколі актуальным. Кожнай з вышэйзгаданых асоб можна прысвяціць асобную працу. Пра Мікалая Багародскага, Антона Брадоўскага, Язэпа Варпаховіча, Данілу Васілеўскага, Мікалая Каспяровіча, Сяргея Мялешку, Аляксея Сапунова і Клаўдзія Ціхамірава напісана ў даведніку віцебскага гісторыка і краязнаўцы Мікалая Півавара «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.» *[6]*. Звесткі пра іншых асоб яшчэ неабходна ўводзіць у навуковы ўжытак.

У фондах Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі захоўваецца значны комплекс асабістых дакументаў кіраўнікоў Цэнтральнага бюро краязнаўства – выхадцаў з Віцебшчыны. Сярод іх асабістая справа ўдзельніка краязнаўчага руху на Сенненшчыне, намесніка (1926–1928), а затым старшыні ЦБК (1928–1930) Аляксея Казака *[7]*, фармулярны спіс аб службе актыўнага ўдзельніка краязнаўчага руху на Віцебшчыне, навуковага сакратара

ЦБК (1926–1930) Мікалая Касяровіча *[8]*. Тандэм Казак – Касяровіч шмат зрабіў для развіцця краязнаўчага руху Беларусі. Першы быў добрым арганізатарам і адміністратарам, другі – выдатным навукоўцам, які пакінуў значны след у гісторыі і культуры Беларусі.

Архіўныя дакументы захавалі для нашчадкаў імя Хвядоса Іванова, чалавека, які зрабіў значны ўнёсак у вывучэнне Віцебшчыны. Паводле яго пасведчання, выдадзенага для паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову, «Хвядос Рыгоравіч Іваноў выявіў сябе актыўным працаўніком у галіне краязнаўства ў Чашніцкім раёне Віцебскай акругі. Так, ім сабрана пры дапамозе сваіх вучняў больш за 700 картак-слоў народнай мовы Віцебшчыны; да 500 запісаў народных песняў, казак; калекцыя грашовых знакаў і інш.; зроблена каля 5 дакладаў на краязнаўчыя тэмы, арганізавана карысная дзейнасць Чашніцкага раённага таварыства краязнаўства і інш. Апрача таго, ім змяшчаліся артыкулы аб краязнаўстве ў газетах: „Беларуская вёска“, „Віцебская Сялянская“, „Савецкая Беларусь“ і інш.» *[9]*.

Такім чынам, з прыходам у канцы 1917 года да ўлады ў былой Расійскай імперыі бальшавікоў на яе землях пачалася трансфармацыя і арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху. Да 1924 года краязнаўства на Віцебшчыне развівалася ў рэчышчы агульнарасійскага краязнаўчага руху, пасля 1924 года – у рэчышчы агульна-беларускага. Усебаковая падтрымка краязнаўства з боку дзяржавы ў разглядаемы перыяд адыграла вырашальную ролю ў развіцці і інстытуалізацыі краязнаўчага руху як Віцебшчыны, так і Беларусі ў цэлым. Арганізацыйнае афармленне краязнаўчага руху Віцебскага рэгіёна адпавядала адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу БССР: акруговыя краязнаўчыя таварыствы, раённыя краязнаўчыя таварыствы, краязнаўчыя гурткі. На чале гэтых арганізацый было Цэнтральнае бюро краязнаўства – навукова-метадычны цэнтр краязнаўчай работы. Паводле архіўных звестак, на Віцебшчыне ў 1926 годзе дзейнічалі тры акруговыя таварыствы краязнаўства, 25 раённых таварыстваў краязнаўства, 12 краязнаўчых гурткоў. Усе гэтыя арганізацыі займаліся комплексным вывучэннем як свайго рэгіёна, так і ў цэлым Савецкай Беларусі.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.01.2024 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 5.
2. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 22.
3. Аршаншчына: зборнік: у 3 ч. / Аршан. акр. т-ва краязнаўства. – Орша: Газ. «Кам. шлях», 1926. – Ч. 1: Геалагічная пабудова: флора акругі. – 34 с.
4. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 15.
5. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 21.
6. Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: даведнік / М.В. Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 175 с.
7. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 2. Воп. 1. Спр. 4036.
8. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 59–63.
9. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 83.